### Гаспадарская праца

Вельмі карысна, што невялічкія грудкі з новае беларускае эміграцыі ад некаторага часу праяўляюць ініцыятыву самастойнае рамесьніцкае працы. Няхай за іх прыкладам ідуць усе іншыя рамесьнікі.

Апрача таго, патрэбныя арганізацыі гаспадарскага характару — узаемнае памогі, касы ашчаднасьці, таварыства забесьпячэньня на старасьць, на прыпадак хваробаў. Дзе вы, гаспадарскія працаўнікі?

Аўтар гэтых радкоў не ўважае, што сказаў ён тут пра другую ўмову неасыміляваньня ўсё чыста, што нічога да яго дадаць ані разьвіць сказанага нельга. Наадварот, я ўважаю гэта за сусім магчымае й пажаданае. Адна просьба, адылі, ня толькі мець наўвеце патрэбы, але й тарнавацца да магчымасьцяў, не плянаваць абстрактна, ня ўносіць фразэалёгічнае хваробы.

# Ліст у Рэдакцыю

Паважаны Спадару Рэдактару, не адмоўцеся, калі ласка, надрукаваць у „Бацькаўшчыне“ наступнае.

Даведаўшыся, што некаторыя мае знаёмыя выказалі зычэньне, каб, робячы ім якія ўпікі ў іхнай грамадзкай працы, падавалі іхныя прозьвішчы з тым, што будзе ім даная магчымасьць у тым–жа месцу (газэце, часапісе) зрабіць патрэбныя (зь іхнага гледзішча) выясьненьні, я што да сябе прылучаюся да такога зычэньня і буду ўдзячны за яго спаўненьне.

*Я. Станкевіч*

У Нью Ёрку, 8 ліпня 1955.

# Зьвярненьне да выдаўцоў і собсьнікаў беларускіх кніжак на продаж

Пасьпешна трэба выдаць каталёг беларускіх кніжак і часапісаў, якія можна купіць на гэтым баку зялезнае завесы. Часта розныя ўстановы зварочуюцца з просьбаю прысладь ім каталёг беларускіх кніжак, і нельга гэтага зрабіць, бо каталёгу няма.

Дзеля таго я зварочуюся да ўсіх арганізацыяў і прыватных асобаў із просьбаю прыслаць мне як рэфэрэнту культуры Беларуска–Амэрыканскага Задзіночаньня ведамкі, якія яны маюць на продаж беларускія кніжкі й часапісы, падаючы аўтара, назоў кніжкі і пераклад яго на ангельскую мову, месца й год выданьня, колькасьць бачынаў, цану і дакладны адрыс, на які трэба зварочавацца, купляючы кніжкі. Адзержыўшы такія ведамкі, Беларуска–Амэрыканскае Задзіночаньне выдасьць каталёг.

# Зьвярненьне да ўсіх, хто мае беларускія тэатральныя творы

Сярод беларускае эміграцыі ў Задзіночаных Гаспадарствах Амэрыкі, а пэўне і ў іншых краёх, ёсьць вялікая нястача беларускіх тэатральных твораў, ад чаго запыняецца тэат-